Аўтар: Рэдакцыя
10.03.2019 00:00

 Папа Францішак прыняў прадстаўнікоў епіскапату Казахстана, а таксама каталіцкіх ардынарыяў Кыргызстана, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана, якія прыбылі ў Рым з візітам “Ad limina Apostolorum”. Пастыры лакальных Касцёлаў выказалі Пантыфіку пажаданне, каб Апостальская Сталіца стварыла Канферэнцыю Біскупаў Казахстана і Цэнтральнай Азіі. На іх думку, такое рашэнне магло б умацаваць падтрымку Касцёла ў 4-ох самых малых краінах рэгіёна, дзе вернікаў вельмі мала, і яны даручаны пастырскай апецы некалькіх місіянераў, святароў і кансэкраваных асоб. †

 Ва Утрэхце (Галандыя) выстаўлены на продаж будынак катэдральнага сабора св. Кацярыны, утрыманне якога стала занадта дарагім для невялікай колькасці вернікаў. Супраць продажу святыні выказалі пратэст католікі ўсёй дыяцэзіі, а таксама вернікі з іншых гарадоў і нават краін. У інтэрнэце нераўнадушныя ставяць свой подпіс пад адпаведнай петыцыяй. Канчаткова лёс сабора вырашыць Святы Пасад, паколькі гаворка ідзе пра катэдральную парафію, а не толькі пра парафіяльную святыню.

 Парагвай намераны стварыць новую паломніцкую трасу. Планаваны “Шлях слядамі езуітаў” будзе нагадваць пра вёскі, заснаваныя на пачатку XVII стагоддзя місіянерамі з Таварыства Езуса ў цэнтральнай частцы Паўднёвай Амерыкі, якія павінны былі ахоўваць мясцовых індзейцаў ад гандлю нявольнікамі. Гэтыя вёскі, называемыя рэдукцыямі, размяшчаліся на землях сучасных Парагвая, Аргенціны, Бразіліі, Уругвая і Балівіі. Усе рэдукцыі былі ліквідаваны ў 1767 годзе. Праз 250 гадоў аб гэтым наследдзі айцоў езуітаў будзе прыгадваць падрыхтаваная паломніцкая траса.

 Сенат ЗША не прыняў закон, які забараняе дзетазабойства немаўлят, што нарадзіліся нягледзячы на аборт. Для яго прыняцця не хапіла 7 галасоў з 60-ці. Закон павінен быў абавязаць урачоў прадастаўляць такім дзецям любую неабходную дапамогу і транспартаваць іх у бальніцу. Сёння, напрыклад, у штаце Нью-Ёрк жанчыны могуць правамерна практычна без абмежаванняў выконваць аборты на працягу ўсёй цяжарнасці. Акрамя таго, пасля кансультацый паміж урачамі і маці можа быць прынята рашэнне аб смерці нованароджанага, г. зн. праведзена эўтаназія.

 Лаўрэат прэміі “Оскар” 2019 года Рэгіна Кінг, якая атрымала ўзнагароду як лепшая актрыса другога плана ў фільме “Калі б Біл-стрыт магла загаварыць”, у сваёй прамове падзякавала за сваё выхаванне маме. “Я вельмі ўдзячна табе за тое, што навучыла мяне: Бог заўсёды з клопатам выходзіць насустрач, Бог заўсёды добры”, – сказала актрыса. Гэтыя словы выклікалі ў многіх сабраных слёзы. Кінг сыходзіла са сцэны пад гучныя

апладысменты.

credo.pro; vaticannews.va; niedziela.pl